Министерство образования Республики Беларусь
Учреждение образования «Барановичский государственный университет»
Студенческое научное общество БарГУ

# СОДРУЖЕСТВО НАУК. БАРАНОВИЧИ-2016

Материалы XII Международной
научно-практической конференции
молодых исследователей

(Барановичи, 19—20 мая 2016 года)

В трёх частях

Часть 1

Барановичи
БарГУ
2016

Репозиторий БарГУ

УДК 001(082)

В часть 1 сборника материалов XII Международной научно-практической конференции молодых исследователей «Содружество наук. Барановичи-2016» включены материалы докладов по актуальным проблемам различных научных направлений: филологические науки (русский, белорусский языки); лингвистика (английский, немецкий языки); методика преподавания иностранного языка, правоведение.

Сборник адресован преподавателям и студентам учреждений высшего образования, магистрантам, аспирантам.

Редакционная коллегия:

А. В. Никишова (гл. ред.), А. В. Прадун, В. Н. Кременевская (отв. секретари),
О. Н. Фенчук, Т. М. Пучинская, А. А. Савко, Н. А. Егорова, М. В. Андрияшко

Рецензент

кандидат педагогических наук, доцент, заведующий кафедрой германских языков факультета
международных отношений Белорусского государственного университета М. Ф. Арсентьева

Репозиторий БарГУ

**ISBN 978-985-498-735-4 (ч. 1)**
**ISBN 978-985-498-734-7**
© БарГУ, 2016

| | |
|---|---|
| Грибни́к (м. р.) ‘место в лесу, где растёт много грибов’ (Шуйское Владимирское) | Грибни́к 1) ‘тот, кто собирает или любит собирать грибы’;<br>2) (устар.) ‘продавец грибов’ |
| Зака́т (м. р.) ‘скользкое, накатанное полозьями место на зимней дороге; раскат’ (Новгородское, Московское) | Зака́т (м. р.) 1) ‘заход за линию горизонта (о солнце, небесных светилах’);<br>2) ‘огненно-красное освещение неба над горизонтом при заходе солнца’ |
| Лежа́к (м. р.) ‘место для лежанья на печи; припечек; лежанка’ (Калинградское) | Лежа́к (м. р.) 1) ‘деревянная койка для отдыха на открытом воздухе, на пляже’;<br>2) ‘лежачее бревно, брус’ |
| Ло́жа и ложа́ (ж. р.) ‘место для спанья, кровать, постель’ (Смоленское, Колымское, Якутское) | Ло́жа (ж. р.) 1) ‘место в зрительном зале, отделённое для нескольких лиц’;<br>2) ‘отделение масонской организации’ |
| Свеко́льник и свёкольник (м. р.) ‘свекольник. Место, где растёт свекла’ (Калининградское) | Свеко́льник (м. р.) 1) ‘суп из свёклы’;<br>2) ‘свекольная ботва’ |
| Се́нник (м. р.) ‘огороженное место в степи, на лугу, у дома, где стоит стог (стога) сена’ (Уральское) | Сенни́к (м. р.) 1) ‘матрас, набитый сеном или соломой’;<br>2) ‘сарай для сена, сеновал’ |

Рисунок 1 — Окончание

В приграничных русских народных говорах в ряде имён существительных с локативной семантикой заметно влияние белорусского языка.

Например: *попели́ще (ср. р.) ‘место, где был пожар, пепелище’ (Владимирское, Смоленское, Курское)* (сравним белорусское попел); *блугода́ (ж. р.) ‘место в лесу, где плутает заблудившийся скот’ (Архангельское, Смоленское)* (сравним белорусское блукать).

**Заключение.** Группа локативов с тождественными лексическими и частными словообразовательными значениями (*голубятня и голубятник* и др.) является наиболее многочисленной. Следует отметить, что большинство кодериватов достаточно долго и мирно сосуществуют в языке, занимая одни и те же «семантические клеточки» [2].

В качестве основного внеязыкового ограничения для словообразовательной категории суффиксальных локативов выступает незначительная востребованность подобных производных в современной русской речи. Новые суффиксальные дериваты, называющие пространство, в русском языке в настоящее время не образуются. При этом локативы, называющие территории и вместилища, обладают определённой степенью востребованности в северно-русских (Архангельском, Олонецком, Костромском) диалектах и среднерусских (Псковском, Владимирском, Тверском) говорах [3].

**Список цитируемых источников**

1. Белякова Г. В. Словообразовательная категория суффиксальных локативных существительных в современном русском языке : монография. Астрахань : Астрах. ун-т, 2007. 170 с.
2. Там же. С. 72.
3. Там же. С. 99.

УДК 821.161.3(035.3)

**М. С. Ліс**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

## КАНФЛІКТ ПРЫРОДЫ І ЦЫВІЛІЗАЦЫІ ЯК МАТЫЎ БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЫ «ЭПОХІ РУБЯЖА»

**Уводзіны.** Зварот да духоўнай спадчыны продкаў, культурна-гістарычнай памяці, інтэрпрэтацыя вобразаў і матываў, якія належаць традыцыі, з’яўляецца важнай умовай плённага мастацка-філасофскага асэнсавання сучаснасці. Глыбінныя сэнсавыя значэнні вобразаў этнапрасторы захоўваюцца і перадаюцца ў пэўнай сістэмнасці ад міфалогіі і вуснай народнай творчасці да арыгінальнай літаратуры. Аднак з канца XIX ст., калі Беларусь пакрываецца сеткай чыгунак, бярэ пачатак гісторыя антрапагенных (дэфармаваных чалавекам) ландшафтаў як вынік узаемадзеяння тэхнікі і прыроды.

**Асноўная частка.** Даследчык М. Бярдзяеў у сваёй працы «Сэнс гісторыі» гаворыць, што пераход культуры ў цывілізацыю звязаны з радыкальнай зменай адносін чалавека да прыроды. Філасаф падкрэслівае, што эпоха цывілізацыі пачалася з пераможнага ўваходжання машын у жыццё людзей. Паміж чалавекам і прыродай з’яўляецца

© Ліс М. С., 2016



Репозиторий БарГУ

штучнае асяроддзе, пры дапамозе якога ён спрабуе падначаліць сабе прыроду. Ад сузірання прыроды чалавек пераходзіць да авалодання ёю, што, аднак, не набліжае яго да яе ўнутранага жыцця, яе душы. Чалавек канчаткова аддаляецца ад прыроды ў працэсе тэхнічнага авалодання ёю. Цывілізацыя мае не духоўны і не прыродны грунт, а машынны. У цывілізацыі само мысленне становіцца тэхнічным [1]. Гэтая праблема хвалявала беларускіх пісьменнікаў і адбілася ў творчасці П. Галавача, Я. Коласа, Я. Купалы, К. Чорнага.

Для паўнавартаснага існавання чалавеку неабходна пэўная псіхалагічна-этнічная «ўтульнасць», якую для беларусаў забяспечвае трохкампанентная вертыкальная мадэль свету, што складаецца з зямлі, лесу і неба. Якуб Колас, пісаў І. Навуменка, як ніхто ў беларускай літаратуры, адчуў, што беларусы — народ, цесна знітаваны з прыродай, спрадвеку «лясны». Для беларускага сялянства «лес, возера, рэчка, балота, адваяваны ў лесу кавалак поля былі той штодзённасцю, якая акружала яго ад нараджэння да смерці. Чалавек стагоддзі, тысячагоддзі жыў у лесе, прывык быць на адзіноце, сам-насам з лесам, з полем, небам над галавой…» [2, с. 165]. Нездарма дзед Талаш («Дрыгва») так «любіць лес, балота і сваю родную Прыпяць…» [3, с. 664]. Як адзначае А. І. Белая, «у творах беларускай паэзіі і прозы можна знайсці шматлікія варыянты спалучэння разнастайных элементаў ландшафту, якія абумоўліваюць гарманічны стан героя (аўтара, апавядальніка)» [4, с. 83]. Паэму Я. Коласа «Новая зямля» ў гэтых адносінах можна лічыць і ўніверсальным, і яскравым нацыянальным прэцэдэнтам. «Лес наступаў і расступаўся, // Лужком зялёным разрываўся; // А дзе прыгожыя загібы так міла йшлі каля сядзібы, // Што проста імі б любаваўся» [5]. Сімволіка лесу ў «эпоху рубяжа» ўключаецца ў самыя розныя кантэксты, нават у кантэкст асэнсавання эстэтычнай праблематыкі, творчага метаду пісьменніка. «Маляваць сучасную гістарычную эпоху, — пісаў у 1920 г. З. Бядуля, — вельмі цяжка, як цяжка маляваць выгляд лесу, стоячы ў ім. Трэба, каб пачуцці і погляды сучасніка адстоіліся і выспелі, каб ён мог іх маляваць аб'ектыўна і спакойна...» [6, с. 106].

Перыяд сацыялістычнага будаўніцтва як этап «эпохі рубяжа» характарызуецца, на думку М. Пришвіна, тым, што ў гэты час «будучае робіцца рэальней за сённяшняе». Пісьменнік рэпрэзентуе гэтую пануючую тэндэнцыю праз арыгінальнае выкарыстанне локуса лесу. Цэласнасць і гармонія свету, якую сімвалізуе лес, у перыяд індустрыялізацыі страчваецца. «У мінулым годзе інжынер заблудзіўся ў лесе. Цяпер тут горад, а лес стаіць воддаль. Але які гэта лес, калі ён асуджаны, яго заўтра не будзе, гэты лес амаль нерэальнасць. Затое вось механічны цэх, якога яшчэ няма, — ён рэальнасць» [7, с. 183].

У першай трэці XX ст. праблема супрацьстаяння прыроды і культуры, культуры і цывілізацыі надзвычай абвастраецца. У мастацкую літаратуру пачынаюць увахадзіць антрапагенныя ландшафты, а таксама праз супастаўленне ўмяшчальнага і антрапагеннага ландшафтаў у ёй актыўна асэнсоўваюцца супярэчлівыя ўзаемадачыненні культуры і цывілізацыі» [8]. Так, напрыклад, у рамане П. Галавача «Праз гады» гэта адлюстравалася ў развагах інжынера на пабудове камбіната: « …ёсць свая прыгажосць і ў стройнасці заводскіх гмахаў, і ў рухах машын. Яе нават не менш там, чым у прыродзе, але яна іншая, і мы пакуль што не ўмеем зрабіць так, каб побач з ёй захаваць і вось гэта. — Ён паказвае на прыазёрны лес» [9, с. 292]. З гэтых слоў вынікае, што людзі ў пагоні за матэрыяльнымі дабротамі зусім бяздумна разбураюць тое прыгожае, што акружае іх спрадвеку. Павел Андрэевіч Буднік на гэтыя словы адказаў так: «Навучыцца гэтаму не так цяжка» — і адразу сустрэў нязгоду з боку прафесара Галынскага: «Думаеце, што няцяжка? А мне здаецца, што гэта дужа цяжка. У нейкім сэнсе гэта нават цяжэй, чым пабудаваць сам камбінат, чым стварыць новую прыгажосць, пра якую гаворыць інжынер» [10]. Прафесар Галынскі падкрэслівае: «Каб будаваць, зусім не трэба ўсім рабочым быць інжынерамі і нават кваліфікаванымі будаўнікамі» [11], а каб захаваць прыгажосць прыроды «неабходна ўсім, хто будзе жыць тут і хадзіць па гэтых месцах, быць культурнымі. Навучыцца класці з цэглы сцяну лягчэй, чым авалодаць нават самымі пачаткамі культуры» [12]. Са слоў прафесара вынікае тое, што ўсё ж такі прыроду магчыма захаваць, але для гэтага людзі павінны навучыцца цаніць яе так, як цанілі нашы продкі і авалодаць хоць бы пачаткамі культуры. Буднік нібыта і пагаджаецца, кажучы: «Мы захаваем лес каля возера некранутым. Возера будзе месцам здаровага адпачынку» [13]. Можна ўбачыць у гэтым эпізодзе, з аднаго боку, тое, што ёсць неабыякавыя адносіны да навакольнага асяроддзя, а з другога — імкненне як найпаўней выкарыстаць багацце прыроды для практычных мэт.

Як адзначае І. А. Чарота, «відаць, не выпадкова... у беларускіх гаворках надзіва шматлікі сінанімічны рад, утвораны словамі *алёс, багна, балота, бездань, віць, валага, волага, гала, дрыгва, дрыгвянік, імшара, імшарына, імшарышча, машара, мраіва, мроіва, мярэча, небель, нетра, ройста, слата, тапіла, твань, тхлань...* У дачыненні да іншых відаў ландшафту падобнага не назіраецца» [14, с. 108]. А. М. Багдановіч заклікаў ствараць паэзію лесу, паэзію дрыгвы і сам актыўна ажыццяўляў гэта, выносіў на шырокі свет. У літаратуры «эпохі рубяжа» матыў балота рэпрэзентаваны ў разнастайных элементах мастацкай формы твораў розных жанраў.

Палітыка індустрыялізацыі «імкліва ўносіла змены ў звыклы беларускі краявід, парушаючы яго прасторавую ўтульнасць» [15]. Нездарма, як адзначае І. А. Чарота, у пэўны перыяд развіцця беларускай савецкай літаратуры ўзнікла тэматычная лінія «антыдрыгвы» [16], да якой спрычыніліся і самыя значныя, таленавітыя пісьменнікі. Каля возера Сыты мох, піша П. Галавач у рамане «Праз гады», цяпер «усё інакш. Простая лінія новай, пракладзенай ад балота, дарогі. Уздоўж дарогі… сцены заводскіх гмахаў і чатырохпавярховы гмах электрастанцыі. Свежыя, аплеценыя рыштаваннямі сцены цягнуцца… у глыб поля», чуваць гул машын і «размераныя звонкія ўдары жалеза аб жалеза» [17].

Адносіны людзей да каштоўнасцей прыроды П. Галавач выяўляе ў дыялогу прафесара Галынскага з пісьменнікам і журналістам Ягуплам: «Вазьміце хоць бы гісторыю балот. Гэта ж тысячагоддзі! У глухіх, дзікіх, закінутых чалавекам месцах, у месцах, ад якіх уцякаў чалавек, ляжаць пад імховымі сховамі каштоўнасныя багацці. Балота не хацела паказаць чалавеку гэтых багаццяў, яно засмоктвала смельчакоў. А пасля чалавек выкраў гэтыя багацці і пачаў браць іх сабе, урэшце пазнаўшы іхнюю каштоўнасць, і былое, дзікае, закінутае чалавекам месца



Рэпазіторый БарДУ

стала…» [18]. Мы бачым, што гэтымі словамі прафесар хоча паказаць Ягуплу тое, што чалавек паступова пачаў умешвацца ў прыроду, «выкраў багацці і пачаў браць іх сабе» і да чаго гэта прывядзе ў будучым не ведае ніхто. У рамане не менш важным з'яўляецца факт стварэння на Яснаўскім балотным масіве навукова-даследчай тарфяной станцыі. Туды едзе працаваць прафесар Галынскі. І хоць мы бачым з папярэдняга выказання, што прафесар ставіцца адмоўна да парушэння прыроднага балансу, ён усё роўна згаджаецца на прапанову Будніка стаць адказным кансультантам па праектаванні першай чаргі камбіната і выступіць на пасяджэнні Сарнаўкама з дакладам. Сацыяльныя праблемы цесна звязаны з маральна-этычнымі. Галынскі вельмі даўно ўжо працуе «над праблемай прыгатавання з торфу пластычных мас. Апошнія вынікі ягоных работ даюць падставы спадзявацца, што шуканні блізяцца да канца. …Чаканне запоўніла яго цалкам. Усё іншае яго хвалюе толькі нейкі час і праходзіць, губіцца ў памяці, астаючыся па-за кругам думак, якімі ён жыве» [19]. На нашу думку, сімволіка пластычных мас роднасная сімволіцы «вінціка». Праз канцэпцыю вобраза Галынскага рэалізуецца думка аб недапушчальнасці звядзення чалавека да нейкай адной якасці. Сімволіка торфу ў сукупнасці з локусам балота ўтвараюць яшчэ адзін актуальны для 1930 гг. матыў, звязаны з праблемай навукова-тэхнічнага прагрэсу.

**Заключэнне.** Адным з матываў беларускай прозы першай трэці ХХ ст. з'яўляецца канфлікт прыроды і цывілізацыі. З'яўленне такога матыву ў «эпоху рубяжа» можна растлумачыць тым, што ў гэты час у грамадстве ажыццяўляецца палітыка індустрыялізацыі. Пры дапамозе тэхнікі чалавек імкнецца падначаліць сабе прыроду. Прыродныя ўмовы актыўна ўплываюць на свядомасць народа, генезіс яго нацыянальнай душы. У літаратурных творах розных жанраў увасоблены шматлікія варыянты спалучэння разнастайных элементаў звыклага ландшафту, якія абумоўліваюць раўнаважны, гарманічны стан асобы персанажа, героя-апавядальніка, аўтара. Эстэтыка-філасофская думка «эпохі рубяжа» ўзнімае вострую праблему супрацьстаяння прыроды і культуры, культуры і цывілізацыі, якую мы вылучылі ў рамане П. Галавача «Праз гады».

### Спіс цытуемых крыніц


1. Бердяев Н. Смысл истории [Электронный ресурс]. URL: http://predanie.ru (дата обращения: 01.03.2016).
2. Навуменка І. Я. Якуб Колас: Духоўны воблік героя. 2-е выд., дап. Мінск : Выд-ва БДУ, 1981. 240 с.
3. Колас Я. Вершы. Паэмы. Апавяданні. Аповесці. Трылогія «На ростанях» ; прадм. М. Мушынскага. Мн., 2007. 1168 с.
4. Белая А. І. Абрысы роднага: нацыянальныя локусы культуры ў беларускай прозе «эпохі рубяжа» : манагр. ; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Баранав. дзярж. ун-т. Баранавічы : БарДУ, 2015. 206 с.
5. Колас Я. Вершы. Паэмы. Апавяданні. Аповесці. Трылогія «На ростанях». С. 427.
6. Чыгрын І. П. Паміж былым і будучым: проза Гарэцкага. Мінск : Беларус. навука, 2003. 166 с.
7. Пришвин М. М. Дневники ; сост., предисл. и коммент. Ю. А. Козловского. М. : Правда, 1990. 480 с.
8. Белая А. І. Абрысы роднага: нацыянальныя локусы культуры ў беларускай прозе «эпохі рубяжа». С. 94.
9. Галавач П. Праз гады : раман : для стар. шк. узросту / маст. А. І. Карповіч. Мінск : Юнацтва, 1992. 382 с.
10. Там жа. С. 292.
11. Там жа.
12. Там жа. С. 292—293.
13. Там жа.
14. Чарота І. А. Пошук спрадвечнай існасці: беларуская літаратура ХХ стагоддзя ў працэсах нацыянальнага самавызначэння. Мінск : Навука і тэхніка, 1995. 159 с.
15. Белая А. І. Абрысы роднага: нацыянальныя локусы культуры ў беларускай прозе «эпохі рубяжа». С. 101.
16. Чарота І. А. Пошук спрадвечнай існасці: беларуская літаратура ХХ стагоддзя ў працэсах нацыянальнага самавызначэння. С. 112.
17. Галавач П. Праз гады. С. 320.
18. Там жа. С. 274.
19. Там жа. С. 375.


УДК 81

**А. Е. Магарцова**
*Образовательное учреждение высшего образования «Смоленский гуманитарный университет», Смоленск, Россия*

## ЛИНГВОКУЛЬТУРОЛОГИЧЕСКИЕ РЕАЛИИ В РОМАНЕ МАРГАРЕТ МИТЧЕЛЛ «УНЕСЁННЫЕ ВЕТРОМ»

**Введение.** Читая исторический роман М. Митчелл, мы с интересом окунаемся в это захватывающее и увлекательное по сюжету произведение, события которого происходят в один из наиболее сложных периодов в истории США и охватывают годы Гражданской войны (1861—1865) между северными промышленными и южными земледельческими штатами Америки, и последовавшую за ней Реконструкцию. Осмысливая текст романа, мы невольно начинаем задумываться над тем, как хорошо было бы побывать в тех местах, которые описаны в книге, или попробовать блюда и напитки, которые были упомянуты на страницах романа.

Наша научная работа является попыткой анализа лингвокультурологических реалий в произведении М. Митчелл «Унесённые ветром». Проблема, освещённая в данной работе, актуальна и сегодня. Читатели часто

© Магарцова А. Е., 2016

Репозиторий БарГУ